Наш народ, як, дарэчы, і ўсе іншыя народы, мае схільнасць спрабаваць заглянуць у будучыню, захоўваць і перадаваць з пакалення ў пакаленне рознага роду пракметы, павер'і і забабоны, якія з'яўляюцца выразнікамі шматвяковага гаспадарчага і жыццёвага вопыту народа, яго назіранняў і ведаў аб прыродзе і грамадстве, зборам практычных парад і рэкамендацый.

Што найбольш цікавіла сялян? Канешне, надвор'е і усё, што з ім звязана. Таму большую частку прыкмет складаюць прыкметы пра пагоду, якія збіраліся вякамі. Пагоду можна прадказаць па паводзінах жывёл, па змяненнях акружаючай прыроды і г.д.



# Даўгасрочныя прагнозы



Арэхаў многа, а грыбоў мала - зіма будзе снежнай і суровай
Бур'яны выраслі высокімі - зімой будзе многа снегу

Дуб раней распусціўся, чым ясень - да сухога лета
Лепш убачыць у хляве ваўка, чым на Грамніцы сонца хоць на адну хвілінку

Лістапад прайшоў дружна - зіма будзе суровай

На Грамніцы (02.02) пятух нап'ецца, то на Юр'я вол напасецца

Многа жалудоў на дубе - чакай суровай зімы
Многа ідзе соку з бярозы - лета будзе дажджлівае (праверана)
Многа шчаўя - да снежнай зімы
Многа рабіны - да мокрай восені

Позняе цвіценне рабіны - да цёплай і доўгай восені

Дожджык, дожджык, секані
Я паеду на свінні !
Дожджык, дожджык, перастань,
Я паеду да Клюшчань (Трашчань) і г.д.

Кот траву есць - будзе дождж
Кот скрабе падлогу кіпцямі - на непагоду
Другое сонца нібы кавалачак радугі, злева ад сонца на заходзе - на дождж
Мурашкі выходзяць са сваіх сховішчаў - на дождж
Куры купаюцца ў пяску - будзе дождж

Вецер пыл круціць - на навальніцу
Пчолы перад дажджом злыя
На захадзе з-пад хмар нібы промні высвечваюць - заўтра дождж будзе
Ільля наробіць гнілля
Кветкі  дзьмухаўца перад дажджом не раскрываюцца
Пасляабедзенны дождж доўгі
Бурбалкі ад дажджу утвараюцца на вадзе - дождж будзе працяглым
Ластаўкі перад дажджом нізка лятаюць
Калі раніцай няма расы - будзе дождж
Гракі пасуцца па траве, або на дарозе - быць дажджу
У вясёлцы асноўны колер сіні - дождж працягнецца
У пагодлівы дзень дзяцел моцна стукае дзюбай - на дождж
У пахмурны вечар добра чутны здалёку гукі -  чакай дажджу
Куры ў час дажджу не хаваюцца - дождж будзе працяглы
Лес гудзіць - на ненасце
Дым з трубы ўніз сцелецца - на непагоду

Калі у вясёлцы больш чырвонага колеру - заўтра будзе пагода
Калі вясёлка ўтварылася пасля дажджу - дождж перастане
Моцная раса з ранку - будзе сонечная пагода
Дым  з трубы проста ўгару падымаецца - будзе пагода
Птушкі ў рад на правадах садзяцца - на працяглую пагоду
Зоркі яркія і бліскучыя - на сухую пагоду
Чайнік  "спявае"  - на мароз зімою, спякоту - ўлетку
Дружна стракочуць казельчыкі і стракозы - будзе сонечная пагода

Якая  пагода на маладзіку стане, такая тыдзень пратрымаецца
Камары "мак таўкуць" - на цяпло
Драч песню заводзіць "драч-драч" - пахаладае
Кот на печы спіць - на холад, на падлозе, або падаконніку - на цяпло
Дровы у плечы гараць з трэскам - на мароз, дымяць - на пацяпленне

## Хочаце верце — хочаце праверце...

Сабака качаецца - на завіруху
Кола млынавое вакол месяца - на мяцеліцу
Вокны пацеюць на пацяпленне
Звяры з лесу выходзяць - будзе адліга

Які першы дзень Новага году такая і зіма будзе
На Мацея дарога пацее
Як Андрэя (29.11.) на лядзе, то Каляды на вадзе (праверана)

# Гаспадарчыя прыкметы

Нясі курачка яечак,
Колькі у Яні (Ані і г.д.) валаскоў
- так прыгаварваюць, качаючы па валасах першае яйка

Памятаю, як мама весела прыгаварвала б'ючы масла:

Біся, біся маслачка,
Разлучыся маслачка!
Жыд з жыдоўкай біўся-біўся,
Жыд з жыдоўкай разлучыўся.
Біся-біся маслачка,
Разлучыся маслачка!

Зязюля першы раз закукавала на "голы лес" – год чакаецца неураджайны

Першы вясенні гром на "голы лес" – таксама чакай неўраджайнага году

У які дзень першы снег выпадзе, у такі вясной гарох трэба сеяць (напр. чацвер)

Усе агароды можна пачынаць абрабляць толькі пасля таго, як прывядзеш у парадак магілкі продкаў.

Зацвіла чаромха – час садзіць бульбу

Цыбулю не садзяць пакуль цвіце чаромха – у пукі (стрэлкі) пойдзе

Клён зацвіў – пара моркву садзіць

Агуркі павінен садзіць мужчына, прычым спіной да ўсходу

Каб атрымаць доўгі і валакністы лён – трэба каб сеяў яго голы мужчына.

## Хочаце верце — хочаце праверце...

Быў такі  выпадак. Жыў у Трашчанах даволі заможны гаспадар, вясёлы і востры на язык. Звалі яго Езапок. Рана-ранютка пайшоў ён сеяць лён, раздзеўся дагала – ніхто ж не ўбачыць, яшчэ цёмненька!

Усё засеяў, прыходзіць дадому на сняданак, а ўжо ўся вёска рагоча, пераказваючы адзін другому як Езапок голы па полю бегаў. І адкуль толькі чэрці даведаліся, цёмненька ж яшчэ было?  Але лён у Езапка, насуперак насмешкам, у той год урадзіўся на славу.

Сталовыя бурачкі садзяць, падперазаўшыся чырвоным паяском

Садзячы  капусту трэба на градку камень палажыць, каб качаны былі цвердымі, як камень

Цыбулю садзяць на Станіслава,(08.05.) каб была, як лава

Агуркі лепш садзіць на Зофію (15.05.)

Калі агуркі пасадзіць на Пахома (27.05), то будзеш іх з градкі насіць мяхом

Як ядуць першую гародніну,то трэба стукнуць лыжкай па лбе (суседа за  сталом) і сказаць: "Навіна ў лоб!"

Квасіць капусту найлепш на маладзіку. Удвая лепш, калі гэта будзе яшчэ і "мужчынскі "  дзень, напр. аўторак, чацвер

Не квасяць капусту ў поўню – будзе мягкая і не смачная

Жанчынам  у "крытычныя" дні не трэба займацца нарыхтоўкамі

Калі ў каго памерла маленькім дзіцятка –не ядуць яблыкаў да Аспажы (15.08)

Калі даюць каму малако і малочныя прадукты – сыплюць крышачку солі

Свінню не коляць на вятху, каб мяса ў гаршку не ўбывала

# Матэрыяльны быт



*Каб грошы вадзіліся*

Левая рука чэшацца – грошы дадуць
На стол не кладуць падушку, ключы, шапку – каб у даўгах не быць
Не пазычаць грошы ў панядзелак
Як пачуюць першую зязюлю – кідаюць некалькі капеек “на зязюльку”
Паказаць кашалёк з грашыма маладому месяцу – грошы прыбываць будуць
Венік у доме ставяць мяцёлкай угару
Не перадаваць грошы з рук у рукі, лепш палажыць на што драўлянае
Не пазычаць грошы ( лепш зусім нічога) па заходзе сонца
Нельга свістаць у доме – грошай не будзе:

Не свішчы ў будынку,
Лепш у дупу Барадынку

Па заходзе сонца не выносіць нічога з дому – грошы будуць выносіцца



## **Хочаце верце — хочаце праверце...**

### *Каб не пасварыцца*



Нельга есці з аднаго куска
Нічога вострага не перадаваць з рук у рукі, лепш пакласці
Нож “сам ляжа” вастрыём уверх – будзе ў доме сварка
Соль рассыпалася – на сварку
Але ўсё гэта можна нейтралізаваць, калі зробіш наступнае: плюнь тры разы праз левае плячо і скажы адну з вядомых малітваў, напрыклад, “Ойча наш”

### *Розныя*



Калі хлеб упаў на падлогу, трэба падняць, пацалаваць і пакласці на стол
Хлеб не рэжуць з двух старон
Не кладуць хлеб ніжняй скарынкай угару
Хлеб трэба даядаць, не пакідаючы кусочкаў – муж або жонка пакінуць

Калі не хочаце каб муж здраджваў - не трымайце дома букет з камышоў
Калі на кончыку носа балячка села – нехта кахае
Зацвілі пазногці – нехта тайна закаханы

Кончык носа чэшацца – народзіцца нехта
Кот “гасцей мые” : з якой стараны лапкай заграбае – адтуль і госць будзе яшчэ: калі галаву мые – мужчына будзе госцем і наадварот
Калі кот дарогу перабягае жанчыне справа –налева – не пашанцуе, а ў другую старану, “за пазуху” – пашанцуе. Тое ж самае і мужчыне, толькі наадварот

Чорны кот дарогу перабег – чакай бяды

Калі, выходзячы ў дарогу прыходзіцца вярнуцца – дарогі не будзе.

Таксама ёсць магчымасць згладзіць непрыемнасць. Трэба вярнуўшыся паглядзецца ў люстэрак і ўсміхнуцца, альбо патрымацца за гузік

Калі звініць у вуху загадваюць жаданне . Трэба, каб хто-небудзь згадаў, у каторым вуху звініць. Калі згадаў – жаданне збудзецца

Вока чэшацца - будзе добра, альбо дрэнна залежыць ад таго, ў якую дату нарадзіўшыся. Калі, напрыклад, чэшацца левае вока, а нарадзіўся ў цотную дату, то гэта добра і наадварот
Тое ж самае, калі спатыкнешся

Сабака вые: калі галаву угару задзірае – на пажар, уніз – на пахаванне

У суботу адзення не мыюць

У суботу не прадуць, кажуць – гэта чарту на порткі

Калі папярхнуўся – водку піць будзеш

Хто нарадзіўся ў нядзелю – фарсістым будзе

Хто ў сераду родзіцца – на ўсе работкі згодзіцца (праверана)

Выходзячы ў дарогу жанчыну спаткаеш – дарогі не будзе, а калі яшчэ і з пустым вядром – лепш вярнуцца

Не мыюць падлогу той вадой, у якой адзенне мылі – людзі языкамі абмываць будуць.

Упала лыжка – жанчына ў хату прыйдзе, нож – мужчына.

Праз нож не ядуць

З нажа не ядуць

Пра ваўкоў і пацукоў за сталом размовы не вядуць

Многа існуе павер'яў, звязаных са святамі, асабліва з такімі, як Каляды і Вялікдзень



# На Каляды

*Для гаспадарлівых людзей*

Калі першы дзень Каляд выдаецца погодлівы, ясны – будзе неўраджайны год, а калі ідзе снег – чакай добрага ураджаю

Калі на небе шмат зорак - летам будзе шмат грыбоў
Калі ў Калядную ноч многа зорак на небе – будзе многа яек, мала зорак – каровы будуць малочныя

Калі на куццю на паркане ёсць снежныя шапкі – будзе многа грыбоў.

Куццю елі пад канец, а ўсяго страў павінна быць не менш, чым 12. Паспрабаваўшы ўсіх, лічылася, калі адрыгнешся, то дачакае куцці на наступны год.

На куццю не выкарыстоўваюць у ежу бульбу.

На першы дзень Каляд не варылі капусту, каб яе летам чэрві не елі



Хто прыйдзе у хату на першы дзень Каляд: калі мужчына – добра, жанчына – цэлы год будзе няўдалы

На куццю не шылі – пальцы нарываць будуць

У гэты дзень стараліся не хадзіць у чужыя хаты, каб жывёла не збягала са двара

Паміж куццямі ( 24.12. – 04.01) не ткалі, не pралі, не насілі ніткі, каб ваўкі авечак не кралі

На куццю не seклі, каб мышы ў доме нічога не пасеклі

*Для моладзі*



Дзяўчына брала, не лічачы палені і несла іх у хату. Калі іх колькасць аказвалася цотнай – быць ёй у гэтым годзе замужам

Падабная варажба: абхапіць рукамі плот і палічыць цотная, альбо не колькасць штакецін

**Хочаце верце — хочаце праверце...**

Прыносілі ў дом пеўня і кожная дзеўка пасыпала зерне. Чыё зерне перш пачне кляваць певень, тая і замуж першай пойдзе

Кідалі боцікі, чый упадзе наском да дзвярэй – тая пойдзе замуж

Дзве дзяўчыны ставілі свае боцікі адна другой уперад. Чый першым ля дзвярэй акажацца – тая выйдзе сёлета замуж

Пасля вячэры выходзілі на вуліцу слухаць, з якога боку сабака забрэша – у тую старану замуж пойдзе

Калі голас у сабакі вясёлы, будзе жаніх малады, калі грубы, глухі – стары
Ноччу пайсці ў хлеў і лавіць авечак: калі зловіш авечку – не выйдзеш замуж, калі барана – выйдзеш

Пасля куцці спяшаліся пад суседскае акно і пільна прыслухоўваліся да іх гаворкі. Калі пачуе першае слова тыпу: “ідзі”, “заходзь” і г.д. значыць выйдзе замуж. І нікому не хочацца пачуць: “сядзь” і г.д.

На ноч пад падушку клалі люстэрка, каб прысніўся суджаны

Адной з самых папулярных забаў у нас было ліццё воску на ваду. Запальваецца свечка, якую трымаюць над міскай з вадой. Выліваюцца розныя фігуркі, бывае, што і нічога не выльецца. Калі выліўся вяночак, альбо пярсцёнак – дзеўка выйдзе замуж, калі калыска – дзіця, а калі воск застывае па капельцы – адны кажуць, што гэта грошы, другія слёзы

Заплюшчыўшы вочы бралі палена: гладкае – муж будзе малады, прыгожы; з тоўстай карой – багаты; без кары – бедны; крывое, сукаватае - па колькасці сукоў – дзяцей, вялікую сям’ю.

Прыносілі дадому пеўня, ставілі міску з вадой і міску з зернем. Калі певень адразу пачынаў зерне кляваць – муж будзе працавіты, калі часта ваду піў, то чакаецца п’яніца

### *На Звяставанне*



Птушка гнязда не віець, дзеўка касы не пляцець
Якое Звяставанне – такое і Змартвыхстанне
На гэта свята нічога нельга з лесу прыносіць, каб змеі да будынкаў не падыходзілі

### *На Вербную*

Вярнуўшыся з касцёла б’юць пасвенчанай вербачкай таго, хто не быў, прыгаварваючы:

За сем дзень – Вялікдзень,
За сем ноц – Вельканоц
Не я б’ю, верба б’ець

Прыйшоўшы з касцёла, трэба з’есці тры пупышкі вербы і запіць свянцонай вадой – каб не балеў страўнік

Галінкай пасвенчанай вербы выганяюць першы раз кароўку у поле



## *На Вялікдзень*



У чысты чацвер трэба ўстаць да ўсходу сонца і прычасацца пад курчавай бярозай - валасы будуць густыя і шаўкавістыя

У чысты чацвер таксама да сонейка памыцца вадой з бягучага ручая

Дзеўкі падмятаюць вуліцу і прыгаварваюць:

Як мухі на мёд злятаюцца,  
Так да мяне жаніхі хай збіраюцца

У Вялікі чацвер грошы лічылі, каб яны ўвесь год вадзіліся

На Вялікдзень, на зорцы сонейка “іграе”

На Вялікдзень з ранняй імшы, хто першы прыбяжыць дахаты – той ва ўсіх справах будзе першы

У той вадзе, у якой фарбавалася яйка, памыць твар, каб быць ружовым і прыгожым

Пасвенчаным яйкам вадзілі па карове, прыгаварваючы:

“Каб мая кароўка была такой жа  
круглай і гладкай, як гэта яйка”

Шалупінне раскідвалі па градках і па полю, каб яно града не баялася

### *На Андрэя*



Сеюць каноплю, прыгаварваючы:

Канапельцы сею,
Сьвяты Андрэю
Дай мне знаць
З кім век каратаць (пад вянец стаць)

Цікавую гісторыю расказвала мая бабуля пра сваю сяброўку, якая варажыла на св.Андрэя. У тую ноч прысніўся ёй вайсковец, які прыйшоў да іх у дом. Твару яго не запомніла, толькі заўважыла, што ў пале яго шыняля была вялікая дзірка. Прайшоў амаль год, на наступную восень выйшла гэта дзеўка замуж. Аднаго разу, стала папраўляць пасцілку на печы, а пад ёй – шынель. Панесла яго вытрасаць – бачыць: у пале дзірка вялікая выпалена. Тады і сон прыпомніла...

Кладуць саломінку на студню – прысніцца суджаны, па кладачцы павядзе

### *З народнай медыцыны*



Бародаўкі лечаць так:

1. Разразаюць ягаду рабіны і прымацоўваюць на ноч да бародаўкі
2. Завязваюць над бародаўкамі вузялкі і закопваюць пад капеж (у тое месца, дзе капае са страхі вада)
3. Разрэзаць галоўку цыбулі на столькі частак, колькі ёсць бародавак. Кожнай асобнай часткай пацерці кожную бародаўку і выкінуць іх праз левае плячо.

Прышчы вельмі добра лечыць сок свежых ягад каліны

Калі сеў на воку “ячмень” - трэба знянацку паказаць кукіш, каб чалавек напалохаўся.

Скулы (фурункулы) хутка і якасна лечацца такім спосабам: спячы лустачку цыбулі і прымацаваць да скулы. Аднаго-двух раз хапае, каб яна знікла.

Рану найлепш гоіць асінае гняздо. Яно падобна на пергамент, прысыхае да раны і хутка гоіць яго.

Супраць лішаю ёсць такі загавор:

Лішаю, лішаю – я цябе рашаю,
Я цябе рашаю – як свінням мяшаю

*Паўтарыць 3 разы і падзьмухаць на лішай.*

